ВікіпедыЯ

Ірына Анатольеўна Старавойтава

3 Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Ірына Анатольеўна Старавойтава (нар. 19 ліпеня 1974, Слаўгарад, Магілёўская вобласць) — беларуская дзяржаўная дзеячка. Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання (2016—2019). Першы намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь (2018—2023). Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання (з 2023).

Ірына Анатольеўна Старавойтава

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 6-га склікання

12 кастрычніка 2016 — 2019

Прэзідэнт	Аляксандр Лукашэнка
Кіраўнік урада	Андрэй Кабякоў
Нараджэнне	19 ліпеня 1974 (49 гадоў) Слаўгарад, Слаўгарадскі раён, Магілёўская вобласць, БССР, СССР
Адукацыя	МДУ імя А. А. Куляшова
Месца працы	Сацыяльна-гуманітарны каледж МДУ імя А. А. Куляшова

Біяграфія

Нарадзілася 19 ліпеня 1974 года ў Слаўгарадзе Магілёўскай вобласці.

Скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. А. Куляшова, аспірантуру Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

Працавала настаўнікам біялогіі сярэдняй школы № 31 г. Магілёва, выкладчыкам прыродазнаўчага цыкла Магілёўскага педагагічнага каледжа, загадчыкам кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі г. Магілёва, старшым выкладчыкам кафедры педагогікі і пачатковага навучання Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, загадчыкам кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі інстытута развіцця адукацыі г. Магілёва, рэктарам установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны абласны інстытут развіцця адукацыі».

Выбрана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання ад Магілёўскай вобласці. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці (да 28 чэрвеня 2018 года)[1].

26 чэрвеня 2018 года прызначана першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь[2], дзе працавала да студзеня 2023 года. 20 студзеня 2023 года прызначана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання[3].

Зноскі

1. Постановление Совета Республики Национального Собрания Республики Беларусь от 28 июня 2018 года № 229-СР6/IV «Об И. А. Старовойтовой» (https://pravo.by/document/?guid=39

61&p0=L21800229)
2. Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прыняцце кадравых рашэнняў (http://president.gov.by/by/news_by/view/prynjatstse-kadravyx-rashennjau-19003/)
3. Ирина Старовойтова назначена членом Совета Республики Национального собрания (https://president.gov.by/ru/events/irina-starovoytova-naznachena-chlenom-soveta-respubliki-nacionalnogo-sobraniya)

Спасылкі

- На Вікісховішчы пакуль няма медыяфайлаў па тэме, але Вы можаце загрузіць іх
- Старонка на сайце Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (http://www.sovrep.gov.by/pda/by/senators-by/view/staravojtava-iryna-509/)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Ірына_Анатольеўна_Старавойтава&oldid=4547989"